адукацыйную прастору. Гарманізацыя адукацыйнай прасторы Беларусі з сістэмамі адукацый іншых дзяржаў выступае адной з галоўных умоў уваходжання нашай краіны ў еўрапейскія інфармацыйныя патокі, у сацыяльна-эканамічную структуру, у сусветную віртуальную рэальнасць, што паспрыяе ў сваю чаргу павышэнню якасці прафесійнай адукацыі і паспяховаму рэфармаванню агульнай сістэмы адукацыі ў нашай краіне.

**С.В.Аўдзей,** *дацэнт*

## КОМПЛЕКСНЫ ПАДЫХОД ДА СТАНДАРТЫЗАЦЫІ СТРУКТУРЫ І ЗМЕСТУ АДУКАЦЫІ САЦЫЯЛЬНЫХ ПЕДАГОГАЎ САЦЫЯКУЛЬТУРНАЙ СФЕРЫ

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Сацыяльны педагог — спецыяліст, які займаецца педагагічнай дзейнасцю ў соцыуме. Спецыфіка працы такога работніка абумоўлена асаблівасцямі развіцця грамадства, вынікае з яго асноўных праблем і сацыяльнай палітыкі ў цэлым.

Сярод праблем, якія ў першую чаргу патрабуюць сацыяльнай, сацыяльна-педагагічнай дапамогі, трэба адзначыць зніжэнне нараджальнасці, а таксама нараджэнне дзяцей, якім з першых дзён жыцця патрэбен дадатковы догляд. Актуальнай для дзяржавы праблемай з'яўляецца пагоршаны стан здароўя дзяцей, моладзі. Толькі за год у рэспубліцы робяць да 450 аперацый дзецям з ракам шчытападобнай залозы. Павялічылася колькасць дзяцей з псіхічнымі адхіленнямі. Назіраецца павелічэнне колькасці дзяўчынак, якія маюць венерычныя захворванні (узроставая мяжа знізілася да 13-ці гадоў). Такім чынам, праз 10–12 гадоў можам мець яшчэ менш паўнацэнных, здаровых дзяцей. А сям'я без дзіцяці ці з хворымі дзецьмі — гэта ў першую чаргу сацыяльна-педагагічная праблема. Трэба адзначыць, што з'явілася новая сацыяльная праблема — забойства

нованароджаных жанчынамі з групы рызыкі (алкагалічкамі, наркаманкамі). Хаця такіх выпадкаў не многа, але праблема існуе, а спецыялістаў, якія працавалі б над яе вырашэннем, пакуль няма.

Адзначаецца павышэнне агульнай смяротнасці. Патрабуюць асаблівага догляду, уважлівага да сябе стаўлення старыя. У працэнтных адносінах па рэспубліцы іх становіцца больш. Шмат праблем у бліжэйшай будучыні ўзнікне пры ажыццяўленні Закона аб альтэрнатыўнай службе ва Узброеных Сілах. Не акрэслены межы, дзе магчымае праходжанне службы такога тыпу. Не падрыхтаваны спецыялісты, якія будуць кіраваць ваеннаслужачымі і выхаваннем юнакоў.

Праблема, з якой сутыкнулася наша грамадства трынаццаць гадоў таму назад, – гэта аварыя на Чарнобыльскай АЭС, яе сацыяльныя і псіхалагічныя наступствы. У сусветнай практыцы назапашаны вопыт сацыяльна-псіхалагічнай і сацыяльна-педагагічнай дапамогі людзям з посткатастрофным сіндромам, але ён датычыць працы з невялікай колькасцю асоб. У Беларусі сітуацыя значна цяжэй. Магчыма, яна набліжаецца да той, якую перажыла Японія пасля атамнай бамбардзіроўкі Хірасімы і Нагасакі. У выніку чарнобыльскай катастрофы адбылося забруджванне значных тэрыторый. Людзі жывуць на зямлі, на якой дзесяткі гадоў будзе павышаны ўзровень радыяцыі. Яны ядуць харч і п'юць ваду, якія нельга лічыць экалагічна чыстымі. Моладзь атрымлівае моцны псіхалагічны прэсінг цяперашняй і магчымай у далейшым хваробы, сем'і з жахам чакаюць нараджэння дзіцяці, таму што не маюць упэўненасці ў тым, што яно будзе здаровае. Пры вырашэнні гэтых праблем абапіраюцца ў асноўным на дзейнасць медыкаў. Між тым патрэбныя пашыраная псіхалагічная і сацыяльна-педагагічная падтрымка насельніцтва, адукацыя і зняцце інфармацыйнай блакады вакол уздзеяння вынікаў аварыі на здароўе, псіхалагічны стан асобы, сацыяльныя ўмовы жыцця.



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Што тычыцца сям'і, яе выхаваўчых функцый, то тут адбываецца рэзкая змена грамадскіх каштоўнасцей, патрабаванняў да ведаў і здольнасцей бацькоў. Цяпер да сям'і вяртаецца яе значэнне — стварэнне ўмоў для развіцця падрастаючага пакалення. Таму трэба фарміраваць у бацькоў жаданне быць адказнымі за выхаванне, жыццё дзіцяці.

Такім чынам, прафесійная дзейнасць сацыяльнага педагога ў рэспубліцы ажыццяўляецца на фоне значных эканамічных і палітычных змен.

Сучасная педагагічная навука падкрэслівае цяжкасці вылучэння агульных момантаў падрыхтоўкі спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй, стварэння стандартаў адукацыі. Што датычыць падрыхтоўкі сацыяльных педагогаў, то можна сказаць: гэтая прафесія ў "чыстым" выглядзе існуе толькі ў Германіі, дзяржавах СНД, у тым ліку Беларусі. У Швецыі работа такога тыпу мае назву "псіхасацыяльнай", у Францыі спецыялістаў, якія маюць дачыненне да сацыяльна-педагагічнай дзейнасці, называюць аніматарамі. Выпускнікам, якія спецыялізуюцца на аказанні сацыяльна-педагагічнай дапамогі, у Нарвегіі ўручаюць дыплом аб адукацыі ў галіне дабрабыту дзіцяці. Гістарычна ў большай колькасці дзяржаў свету падрыхтоўка сацыяльных педагогаў і сацыяльных работнікаў пачыналася з 1—2-тыднёвых курсаў, на якіх даваліся практычныя веды. Потым былі ўведзены гадавыя і паўтарагадавыя тэрміны навучання. У 70-я гады тэрмін навучання быў працягнуты да трох гадоў, але толькі ў канцы 80-х гадоў выпускнікі па гэтай спецыяльнасці пачалі атрымліваць акадэмічныя ступені бакалаўраў. Пазней з'явіліся праграмы магістэрскай і доктарскай падрыхтоўкі. У Ірландыі магістэрская праграма ва універсітэцкім каледжы Дубліна працуе толькі чатыры гады, таму выкладчыкі атрымлівалі адукацыю ў Англіі ці ЗША.

У Беларусі, Расіі, Польшчы, дзяржавах Балтыі падрыхтоўка сацыяльных педагогаў і спецыялістаў па сацыяльнай рабоце пачыналася з атрымання імі вышэйшай

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

адукацыі. Працэс стандартызацыі, стварэння вучэбнага плана, падрыхтоўкі праграм курсаў для студэнтаў спецыяльнасці "сацыяльная педагогіка" ідзе цяжка. Таму ёсць і аб'ектыўныя, і суб'ектыўныя прычыны.

Па-першае, трэба ўдакладніць паняцце "дзейнасць сацыяльнага педагога". На наш погляд, асновай павінна быць псіхолага-педагагічная дапамога ва ўсіх яе варыянтах для розных слаёў насельніцтва. Калі прытрымлівацца іншага пункту гледжання, можна не заўважыць падмены функцыі дапамогі функцыяй класічнага выхавання (асобна ў аўтарытарным, аднанакіраваным значэнні: выхавацель — выхаванец).

Па-другое, патрабуецца вырашэнне праблемы суадносін тэарэтычных і практычных ведаў для будучых сацыяльных педагогаў. Канечне, мы не хацелі б адмаўляцца ад класічнага высокага ўзроўню тэарэтычнай падрыхтоўкі, які заўсёды давалі вышэйшыя навучальныя ўстановы нашай краіны. Аднак і сёння пры вырашэнні пытання аб выбары прадметаў, якія трэба абавязкова ўключаць у блок спецыяльных дысцыплін, сутыкаемся з цяжкасцямі з-за недастатковых сфарміраванасці сацыяльнай педагогікі як навукі, вылучэння яе абавязковых частак, за кошт якіх адбываецца паглыбленае вывучэнне сутнасці сацыяльнай педагогікі.

Па-трэцяе, патрабуе сур'ёзнай дапрацоўкі пытанне суадносін традыцыйных для вышэйшых навучальных устаноў культуры агульнанавуковых і агульнаспецыяльных дысцыплін, з аднаго боку, і агульнапрафесійных, патрэбных для падрыхтоўкі сацыяльных педагогаў, з другога.

Лічым, што сацыяльнаму педагогу патрабуюцца грунтоўныя веды ў галіне мастацтва і культуры. Таму прадметы, якія ёсць у нашых вучэбных планах, прысутнічаюць і ў планах іншых ВНУ. Аднак у вышэйшых навучальных установах культуры, на наш погляд, трэба мець разгорнутую сістэму ведаў. Прычым міжпрадметныя суадносіны большай колькасці вучэбных прадметаў першага



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

і другога раздзелаў стандарта пажадана ажыццяўляць па двух накірунках:

— гістарычна-цывілізацыйным (ад больш ранніх эпох і цывілізацый да больш позніх);

— дыялектычнага суаднясення агульнатэарэтычнага і прыкладнога падыходаў адначасова (першымі павінны ісці прадметы ці больш абагульненыя, ці, наадварот, прадметы практычна-прыкладнога характару, уменні, навыкі, якімі неабходна карыстацца на наступных этапах вучобы).

Ідэя выкладання розных дысцыплін, якія закранаюць адзін гістарычны перыяд або адну старонку чалавечай дзейнасці, жыццядзейнасці, лічым, з'яўляецца плённай. У студэнтаў ёсць магчымасць развіваць сістэмнае бачанне, выяўляць дыялектычныя сувязі паміж з'явамі, замацоўваць веды.

Прыкладам адбору для прадметаў стандарта і стварэння лагічнай сувязі паміж імі з улікам спецыфікі нашай ВНУ можа быць цыкл агульных псіхолага-педагагічных дысцыплін. У сацыяльных педагогаў гэты цыкл займае асобнае месца. Яго цэнтральнай задачай з'яўляецца набыццё студэнтам фундаментальных тэарэтычных ведаў у галіне псіхалогіі развіцця асобы як у філагенетычным і гістарычным, так і ў антагенетычным напрамках — ад ранняга дзяцінства да глыбокай старасці. Акрамя таго, калі зыходзіць са спецыфікі будучай сферы дзейнасці выпускнікоў, то можна гаварыць аб тым, што ім патрэбныя веды ў галіне псіхалогіі мастацтва. Не выклікае сумненняў і тое, што сацыяльнаму педагогу неабходна паглыбленае вывучэнне агульнапедагагічных сродкаў і шляхоў фарміравання асобы. З улікам таго, што гэтыя вучэбныя дысцыпліны з'яўляюцца асновай спецыяльных ведаў па сацыяльнай педагогіцы, мы вызначаем як неабходны мінімум стандарта і размяшчаем іх па перыядах праходжання наступным чынам (рыс.1).

| Семестры | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 |
| Агульная псіхалогія | | | | | | | | |
| | Узроставая псіхалогія | | | | | | | |
| | | | Сацыяльная псіхалогія | | | | | |
| | | Агульная педагогіка | | | | | | |
| | | | | | | Псіхалогія мастацкай творчасці | | |
| | | | | | | | Этнапсіхалогія, этнапедагогіка | |

Рыс.1

Найбольшыя цяжкасці датычацца адбору ў дзяржаўны стандарт прадметаў для раздзела "Спецыяльныя дысцыпліны". Прычын гэтага дзве.

Па-першае, мы не маем магчымасці пераняць замежны вопыт таму, што ў заходніх стандартах асноўная ўвага адведзена таму боку, які мы лічым другарадным. Нават у вучэбных планах гэта будзе назва аднаго-двух прадметаў. Напрыклад, у вучэбным плане факультэта сацыяльнай работы Кёльнскай вышэйшай школы гэтыя прадметы вызначаны як 1) метады сацыяльнай работы: а) уводзіны ў метады работы, б) тэарэтычныя асновы метадаў (індывідуальная, групавая, абшчынная работа); 2) палявая работа (з напрамкамі — сямейная і індывідуальная дапамога, маладзёжная работа, міжкультурная сацыяльная работа, праца з людзьмі сталага ўзросту і інш.).

Згодна з нашымі традыцыямі стварэння вучэбных планаў і стандартаў патрэбныя больш дэталізаваны пералік прадметаў і менш гнуткая сістэма карэкцыі плана. Таму пры выбары прадметаў, якія ўключаюцца ў пералік абавязковых, неабходны вельмі асцярожныя, прадуманыя рашэнні.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Па-другое, цяжкасці стварэння стандартаў па сацыяльнай педагогіцы маюць вытокі ў спецыфіцы нашай вышэйшай навучальнай установы. У гэтым блоку трэба закласці шэраг прадметаў, якія дазволяць студэнтам на працягу ўсіх гадоў навучання атрымліваць веды, уменні, навыкі для работы сацыяльным педагогам сацыякультурнай сферы, працы з рознымі людзьмі паводле ўзросту, полу, адукацыі, сацыяльнага статусу. Асноўным сродкам дзейнасці нашых спецыялістаў з'яўляецца культура мастацтва.

Зыходзячы з гэтага, мы вынеслі ў трэці блок наступныя прадметы і звязалі іх у лагічную міжпрадметную сувязь (рыс.2).




Рыс.2

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Курс "Уводзіны ў спецыяльнасць", з якога пачынаецца знаёмства студэнтаў з будучай спецыяльнасцю, дае ўсе веды ў сціслым выглядзе. Пры яго вывучэнні студэнты атрымліваюць першапачатковыя веды аб прафесіі, вучэбных дысцыплінах, якія на працягу пяці гадоў забяспечваюць падрыхтоўку высокакваліфікаваных спецыялістаў. У задачы курса таксама ўваходзіць азнаямленне першакурснікаў з асаблівасцямі сістэмы навучання ў ВНУ — як з арганізацыйнымі пытаннямі, так і з тым, што ў вышэйшай школе ў адрозненне ад сярэдняй няма задачніка з правіламі.

Студэнтам прыводзяцца прыклады існавання вялікай колькасці поглядаў на адно пытанне, наяўнасці процілеглых тэорый, якія займаюцца тлумачэннем адной і той жа з'явы. Цяжкасць для выкладчыка, што вядзе гэты курс, заключаецца, з аднаго боку, у неабходнасці мець веды аб сутнасці спецыяльных прадметаў, а з другога, — у пастаянным кантролі за тым, каб пазбегнуць фарміравання ў студэнтаў пачуцця "ўсёведання" аб тых дысцыплінах, якія яны будуць вывучаць у далейшым. Апошняя праблема ўзнікае пастаянна ў кожнага выкладчыка, што вядзе вучэбны прадмет, які з'яўляецца асновай іншага прадмета або вынікае з яго. Таму важна больш увагі надаваць месцу прадмета ў цэласнай падрыхтоўцы сацыяльнага педагога. Пры гэтым трэба зыходзіць не толькі з неабходнасці звязаць змест прадмета з іншымі, але і ўлічваць неабходнасць даваць веды, што будуць працаваць на тую або іншую практыку студэнта. Асноўная мэта вучэбнай і творчай практыкі — падрыхтоўка студэнтаў да работы, выпрацоўка неабходных прафесійных уменняў і навыкаў пры адначасовым замацаванні ведаў, атрыманых з тэарэтычных курсаў.

Такім чынам, да прадметаў сацыяльна-педагагічных дысцыплін можна аднесці: уводзіны ў спецыяльнасць (1-ы семестр), гісторыю і тэорыю сацыяльнай работы (2—3-і семестры), сацыяльную работу (тэорыя) (4—5-ы семестры), методыку работы сацыяльнага педагога (6—8-ы семестры), экапедагогіку (7-ы семестр), педагагічную валеалогію

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

(8-ы семестр), сацыяльна-педагагічнае праектаванне (9-ы семестр).

Прадмет "Методыка работы сацыяльнага педагога" з'яўляецца асноўным у практычнай падрыхтоўцы спецыяліста, але і ён пачынаецца з агульнатэарэтычных пытанняў ў шостым семестры, у наступных семестрах вызначаецца паглыбленай работай у творча-педагагічным накірунку і выпрацоўкай уменняў і навыкаў працы з групамі рызыкі.

Завяршэнне вучэбнага працэсу ажыццяўляецца праз курс "Сацыяльна-педагагічнае праектаванне". Мэта яго — навучанне студэнтаў уменню выяўляць найбольш сур'ёзныя сацыяльна-педагагічныя праблемы грамадства, а таксама абмежаванне кола кліентаў, якія не маюць магчымасці вырашыць гэтую праблему, і (на апошнім этапе навучання) выпрацоўка арганізацыйных, метадычных, тэхналагічных кампанентаў грамадскай ці дзяржаўнай структуры або ўстановы, якая можа вырашыць гэтую праблему.

У курсе "Сацыяльна-педагагічнае праектаванне" аб'ядноўваюцца ў новай якасці ўсе веды, атрыманыя студэнтамі за папярэднія гады навучання.

Асобнае месца ў сістэме падрыхтоўкі сацыяльных педагогаў займае цыкл прафесійна арыентаваных спецыяльных псіхалагічных дысцыплін, якія з'яўляюцца асновай фарміравання асобасных якасцей будучых прафесіяналаў і вызначаюць паспяховасць іх агульнай падрыхтоўкі. Гэта: псіхалагічны трэнінг (3-і семестр), асновы псіхадыягностыкі (5—6-ы семестры), псіхалогія сямейных зносін (5—6-ы семестры), клінічная псіхалогія (6—7-ы семестры), агульная псіхатэрапія (7—8-ы семестры). Кожны з гэтых прадметаў мае функцыю дапамогі. Ведаючы, што мастацтва заўсёды было наймацнейшым сродкам уздзеяння на асобу, рыхтуем студэнтаў да выкарыстання мастацтва ў сваёй дзейнасці. Але без ведаў у галіне агульнай псіхатэрапіі яны не змогуць праводзіць тэрапію мастацтвам на належным узроўні.



РЭПАЗІТОРЫЙ БГПУ

У апошні блок сярод сацыяльных дысцыплін вылучаюцца спецсемінары і спецкурсы, якія дазваляюць гнутка будаваць падрыхтоўку спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй, даваць найноўшыя навуковыя веды, магчымасць далучыцца да навукова-даследчай дзейнасці.

Такім чынам, комплексны падыход да стандартызацыі адукацыі сацыяльных педагогаў сацыякультурнай сферы можна ажыццявіць, улічваючы наступныя фактары:

1. Рэзкае расслаенне грамадства пашырае поле дзейнасці сацыяльнага педагога: амаль усё насельніцтва рэспублікі мае патрэбу ў сацыяльнай, сацыяльна-педагагічнай або сацыяльна-псіхалагічнай дапамозе.

2. Адсутнасць законаў і заканадаўчых актаў, якія рэгламентуюць аказанне такой дапамогі. Нераспрацаванасць механізмаў яе ажыццяўлення і пры наяўнасці неабходнага закона значна ўскладняе працу спецыяліста.

3. Наяўнасць вялікай колькасці спецыфічных праблем, асаблівая сацыякультурная рэчаіснасць не дазваляюць механічна пераносіць сусветны вопыт сацыяльнай і сацыяльна-педагагічнай работы, падрыхтоўкі спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй гэтага профілю.

4. Трэба асцярожна ставіцца да выкарыстання мінулага вопыту працы кадраў сістэмы выхавання, прыўнясення старога вопыту падрыхтоўкі спецыялістаў з-за рэзкай змены сацыякультурнай сітуацыі, патрабаванняў грамадства.

5. Пры адборы вучэбных прадметаў для падрыхтоўкі сацыяльнага педагога ўлічваць тое, што ён будзе дапамагаць асобе фарміраваць у сабе якасці, якія дапамогуць захоўваць упэўненасць у сваіх сілах і ведах, умець прымаць самастойныя творчыя рашэнні, браць на сябе адказнасць, працаваць у стрэсавай сітуацыі пры хуткай змене ўмоў прафесійнай дзейнасці, наогул жыццядзейнасці.

6. Усе прадметы неабходна звязваць у комплексную сістэму, калі змест кожнага з іх працуе на астатнія, — на практыку, абагульняючую дыпломную работу і інш.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ